Галоўныя высновы справаздачы за 2004 год

## Частка I: Перашкоды на шляху захавання міжнароднай свабоды веравызнання

Дыскрымінацыйнае заканадаўства або палітыка, што ўшчамляе асобныя рэлігіі

Беларусь. На працягу справаздачнага перыяду ўмовы для свабоды веравызнання паранейшаму заставаліся нездавальняючымі. Пасля прыняцця ў 2002 годзе закону, які істотна абмяжоўваў свабоду рэлігіі, і заключэння ў 2003 годзе паміж Беларускай праваслаўнай царквой (БПЦ) і ўрадам пагаднення, што павысіла статус БПЦ, улады працягвалі праследаваць іншыя рэлігіі і канфесіі. Новы закон аб рэлігіі прадпісаў усім раней зарэгістраваным абшчынам перарэгістравацца да лістапада 2004 года і адразу забараніў усякую рэлігійную дзейнасць з боку незарэгістраваных раней рэлігійных груп. Урад неаднойчы адхіляў заявы аб рэгістрацыі некаторых з гэтых груп, у тым ліку шэрагу пратэстанцкіх канфесій, абшчын Беларускай аўтакефальнай праваслаўнай царквы і некаторых усходніх рэлігій. Без належнай рэгістрацыі многім з гэтых груп вельмі складана, а падчас і ўвогуле немагчыма арэндаваць памяшканні ці набываць маёмасць для правядзення набажэнстваў. У дзяржаўных сродках масавай інфармацыі працягваліся нападкі на неправаслаўныя рэлігіі. На ўвоз у краіну і распаўсюджванне рэлігійнай літаратуры ўсім рэлігійным групам патрэбна папярэдне атрымаць дазвол урада. Дзяржаўныя датацыі з бюджэту ідуць толькі на адрас БПЦ, якая, па наяўных звестках, мае магчымасць атрымоўваць падатковыя льготы на зямлю і маёмасць. Паранейшаму працягваецца продаж і распаўсюджванне антысеміцкай літаратуры праз дзяржаўную сетку распаўсюджвання СМІ, урадавыя ўстановы, кіёскі і мерапрыемствы, якія маюць дачыненне да БПЦ. Нацыянальная Акадэмія Навук таксама працягвала гандляваць антысеміцкай літаратурай.

## Частка III: Дзейнасць ЗША ў справе адстойвання міжнароднай свабоды веравызнання

Беларусь. Супрацоўнікі амбасады ЗША падтрымлівалі пастаянныя кантакты з прадстаўнікамі рэлігійных груп, Грамадзянскай ініцыятывы за свабоду сумлення і з урадавымі чыноўнікамі, адказнымі за пытанні рэлігіі, ладзілі сустрэчы і дыскусіі па пытаннях свабоды веравызнання паміж амерыканскімі грамадзянамі, якія пастаянна знаходзіліся ў краіне, і тымі, якія прыязджалі ў Беларусь, і прадстаўлялі розныя рэлігійныя кірункі. Амбасада пільна сачыла за працягам гандлю антысеміцкай і ксенафобскай літаратурай у кнігарнях, падчас мерапрыемстваў, што маюць дачыненне

да БПЦ, і праз дзяржаўную сетку распаўсюджвання СМІ. Супрацоўнікі амбасады, сп. амбасадар у тым ліку, наведалі некалькі мерапрыемстваў, якія ладзіліся рознымі рэлігійнымі групамі. Амбасада рэгулярна абмяркоўвала рэлігійныя пытанні з прадстаўнікамі замежных дыпламатычных місій у Беларусі. Амбасада працягвала практыку наладжвання круглых сталоў з удзелам рэлігійных лідэраў з мэтай абмеркавання пытанняў, датычных свабоды веравызнання і праследавання з боку дзяржавы.

**Беларусь**

**Справаздача аб стане свабоды веравызнання за 2004 год**

Падрыхтавана праз Бюро па пытаннях дэмакратыі, правоў чалавека і працы.

Канстытуцыя гарантуе права на свабоду рэлігіі, аднак дзяржава на справе абмяжоўвае гэтае права.

Становішча вакол захавання свабоды веравызнання заставалася па-ранейшаму нездавальняючым на працягу ўсяго справаздачнага перыяду. Урад легалізаваў свае абмежаванні свабоды рэлігіі прыняццем у 2002 годзе новага закону аб рэлігіі і падпісаннем у 2003 годзе Канкардату з Беларускай праваслаўнай царквой (БПЦ), адасабленнем Рускай праваслаўнай царквы, што, на думку многіх, павысіла статус БПЦ і дала гэтай царкве прывілеі, недаступныя для іншых рэлігій. Улады працягвалі праследаваць іншыя рэлігіі і рэлігійныя меншасці. Урад неаднаразова адхіляў заявы аб рэгістрацыі іншых рэлігійных груп, сярод якіх шматлікія пратэстанцкія канфесіі, абшчыны Беларускай аўтакефальнай праваслаўнай царквы (БАПЦ) і некаторых усходніх рэлігій. Без рэгістрацыі многім з гэтых груп цяжка, а часта і зусім немагчыма арэндаваць ці набываць нерухомасць для наладжвання набажэнстваў. На працягу перыяду, які разглядаецца ў гэтай справаздачы, у дзяржаўных сродках масавай інфармацыі працягваліся нападкі на неправаслаўныя рэлігійныя групы. Насуперак няспыннаму праследаванню, некаторыя рэлігійныя меншасці здолелі працягваць дзейнасць у тым выпадку, калі паводзілі сябе стрымана, у той час як іншыя адкрыта заявілі аб сваёй адмове праходзіць рэгістрацыю згодна з новым законам аб рэлігіі.

Свабода веравызнання ў грамадстве захоўвалася дзякуючы агульным прыязным адносінам між канфесіямі; аднак антысемітызм і негатыўнае стаўленне да рэлігійных меншасцяў працягваліся.

Урад ЗША абмяркоўвае пытанні свабоды веравызнання з урадам у межах сваёй агульнай палітыкі па абароне правоў чалавека.

**Раздзел I. Рэлігійная дэмаграфія**

Агульная тэрыторыя краіны складае 80154 квадратныя мілі, а яе насельніцтва – блізу 9990000 жыхароў.

Гістарычна дзяржава заўсёды была арэнай суіснавання, а таксама суперніцтва і канфліктаў паміж рускай праваслаўнай і рымска-каталіцкай цэрквамі. Урад падкрэслівае, што сярод усіх вернікаў прыкладна 80 працэнтаў належаць да БПЦ і ад 15 да 20 працэнтаў або вызнаюць каталіцтва, або лічаць сябе прыхільнікамі рымска-каталіцкай царквы. Ад 50 да 90 тысяч усведамляюць сябе іудзеямі. Ёсць пэўная колькасць пратэстантаў і прыхільнікаў каталіцкай царквы грэчаскага абраду і БАПЦ. Да іншых рэлігійных веравызнанняў належаць крышнаіты, індуісты, бахаісты, адвентысты сёмага дня, стараверы, мусульмане, сведкі Іеговы, апостальскія хрысціяне, кальвіністы, лютэране і некаторыя іншыя. Невялікая супольнасць этнічных татараў, карані якіх сягаюць у глыб XI стагоддзя, вызнае іслам суніцкага кшталту.

Беларусь была вызначана як экзархат Рускай праваслаўнай царквы ў 1989 годзе, тады і была ўтворана БПЦ. Пад кіраўніцтвам патрыяршага экзарха Філарэта колькасць прыходаў па ўсёй краіне за справаздачны перыяд вырасла прыкладна да 1290. У краіне налічвалася таксама каля 400 каталіцкіх прыходаў. Галоўны духоўнік рымска-каталіцкай царквы, як правіла, не ўцягвае царкву ў палітычныя справы. Кардынал забараніў дэманстрацыю ў касцёлах любых дзяржаўных і палітычных сімвалаў.

Паводле ацэнак, на канец савецкага перыяду ў 1989 годзе каля 120 тысяч грамадзян мелі нацыянальнасць яўрэй параўнальна з 50 – 90 тысячамі на канец перыяду, ахопленага гэтай справаздачай. Сама меней палова сённяшняга яўрэйскага насельніцтва пражывае ў Мінску і яго ваколіцах. Большасць грамадзян-яўрэяў не з’яўляюцца актыўнымі вернікамі. З тых, якія лічаць сябе такімі, большасць адносіцца да рэфарматарскіх або кансерватыўных іудзеяў. Ёсць таксама невялікая, але актыўная Любавіцкая суполка. У 2002 годзе пры падтрымцы Амерыканскага яўрэйскага аб’яднанага размеркавальнага камітэта «Джойнт» у Мінску адкрыўся Яўрэйскі абшчынны цэнтр.

Пакуль што невялікая колькасць прыхільнікаў пратэстанцкай веры пастаянна расце. Ад пачатку 1990 года лік пратэстанцкіх аб’яднанняў, зарэгістраваных і незарэгістраваных, больш чым падвоіўся. Згодна з урадавымі і незалежнымі крыніцамі інфармацыі, іх агульная колькасць цяпер перавышае тысячу. Двума самымі буйнымі аб’яднаннямі пратэстантаў з’яўляюцца самастойна зарэгістраваныя саюзы пяцідзесятнікаў і

баптыстаў. Значная колькасць пратэстанцкіх суполак, сярод якіх кірункі харызматыкаў і пяцідзесятнікаў, па-ранейшаму не маюць рэгістрацыі.

Існуе шэраг прыходаў грэка-каталіцкай царквы, якая калісьці лучыла больш як тры чвэрці ўсяго насельніцтва краю, але сур’ёзна пацярпела ад жорсткіх рэпрэсій у эпоху расійскага і савецкага праўлення. Зробленая пасля аднаўлення незалежнасці Беларусі спроба адрадзіць гэтую царкву, што прытрымліваецца праваслаўнага абраду, але падначальваецца Ватыкану, мела ўсяго абмежаваны поспех.

Мусульманская арганізацыя – Духоўны ордэн мусульманаў – утварылася ў 2002 годзе пасля расколу Беларускай рэлігійнай асацыяцыі мусульманаў, асноўнага аб’яднання мусульманаў, якія пражываюць у краіне. Хоць Духоўны ордэн мусульманаў заяўляе, што 90 працэнтаў усяго ісламскага супольніцтва ўваходзіць менавіта ў гэтую новую мусульманскую арганізацыю, такая заява не можа быць пацверджаная.

## Раздзел II. Становішча вакол свабоды веравызнання

### *Прававая і палітычная база*

Свабода веравызнання абвешчана Канстытуцыяй, аднак дзяржава на практыцы абмяжоўвае гэтае канстытуцыйнае права. Нягледзячы на тое, што выпраўленая ў 1996 годзе Канстытуцыя паўторна пацвердзіла роўнасць усіх рэлігій і канфесій перад законам, яна ўсё ж увяла агаворку пра тое, што ўзаемаадносіны дзяржавы і рэлігійных арганізацый «рэгулююцца з улікам іх уплыву на фарміраванне духоўных, культурных і дзяржаўных традыцый беларускага народа». Рэгуляваннем усіх рэлігійных пытанняў у краіне займаецца Камітэт па справах рэлігій і нацыянальнасцей (КСРН) пры Савеце Міністраў Рэспублікі Беларусь.

Насуперак пратэстам міжнародных і нацыянальных праваахоўных арганізацый, Еўрапейскага Саюза, а таксама мясцовых рэлігійных суполак, у тым ліку праваслаўных рэлігійных груп, не прыналежных да БПЦ, у 2002 годзе Прэзідэнт Лукашэнка сваім подпісам афіцыйна ўвёў у дзеянне новы закон аб рэлігіі. Закон сцвярджае «вызначальную ролю праваслаўнай царквы ў гістарычным станаўленні і развіцці духоўных, культурных і дзяржаўных традыцый беларускага народа», а таксама гістарычную значнасць рымска-каталіцкай царквы, артадаксальнага іудаізму, суніцкага кірунку ісламу і евангелічнага лютэранства, гэта значыць, рэлігій, якія прызнаюцца традыцыйнымі для беларускага грамадства. Нягледзячы на тое, што закон абвяшчае намер гарантаваць свабоду рэлігій, у ім утрымліваецца шэраг жорсткіх абмежавальных

элементаў, якія павышаюць узровень кантролю ўрада за дзейнасцю рэлігійных аб’яднанняў. Ён вымагае, каб усе рэлігійныя групы атрымлівалі папярэдні дазвол урада на ўвоз і распаўсюджванне рэлігійнай літаратуры і забараняе замежным грамадзянам узначальваць рэлігійныя арганізацыі, адначасова пазбаўляючы суполкі права ствараць духоўныя навучальныя ўстановы для падрыхтоўкі сваіх святароў. Больш за тое, закон уводзіць складаныя патрабаванні да рэгістрацыі, якія вельмі цяжка выканаць многім як традыцыйным, так і нетрадыцыйным рэлігійным групам. Новы закон запатрабаваў, каб усе раней зарэгістраваныя групы прайшлі перарэгістрацыю да лістапада 2004 года, і адразу пасля свайго ўступлення ў сілу забараніў усякую рэлігійную дзейнасць незарэгістраваных рэлігійных груп.

Новы закон вызначае трохроўневую структуру рэлігійных утварэнняў: рэлігійныя суполкі, рэлігійныя аб’яднанні і рэспубліканскія рэлігійныя аб’яднанні. Рэлігійныя суполкі або мясцовыя пярвічныя рэлігійныя арганізацыі павінны мець у сваім складзе не меней за 20 членаў ва ўзросце не маладзей як 18 гадоў, якія павінны пражываць у дадзенай мясцовасці. Для рэгістрацыі суполка мусіць падаць спіс заснавальнікаў з указаннем іх поўнага імя, месца жыхарства, грамадзянства і подпісамі; экземпляры статута, пратакола ўстаноўчага сходу ўдзельнікаў, а таксама пасведчанне, што пацвярджае права суполкі на валоданне любой маёмасцю, названай у яе ўстаноўчых дакументах. Для тых суполак, якія вызнаюць рэлігіі, раней не вядомыя ўраду, павінна быць пададзена інфармацыя аб гэтай рэлігіі. Згодна з законам, заявы на рэгістрацыю разглядаюцца абласнымі выканаўчымі камітэтамі (аблвыканкамамі) для груп за межамі Мінска, або Мінскім гарадскім выканаўчым камітэтам (Мінгарвыканкамам). Хоць закон і адмаўляе суполкам у праве ствараць установы для навучання сваіх вернікаў, ён дазваляе ім мець нядзельныя школы.

Рэлігійныя аб’яднанні складаюцца з 10 суполак, прычым адна з іх павінна дзейнічаць у краіне не меней як 20 гадоў, і могуць быць заснаваны толькі рэспубліканскімі рэлігійнымі аб’яднаннямі (на агульнанацыянальным узроўні). Для атрымання рэгістрацыі аб’яднанні павінны падаць спіс членаў свайго органа кіравання з біяграфічнымі звесткамі на кожнага, дакумент, які пацвярджае права размяшчэння ў памянёным раёне і пратаколы ўстаноўчага сходу аб’яднання. Згодна з законам, аб’яднанні валодаюць выключным правам на стварэнне рэлігійных навучальных устаноў, правам запрашаць замежных грамадзян для работы з адпаведнымі рэлігійнымі групамі і ствараць манастыры і манаскія аб'яднанні.

Рэспубліканскія рэлігійныя аб’яднанні ствараюцца толькі ў тым выпадку, калі дзеючыя рэлігійныя суполкі ёсць у большасці абласцей дзяржавы. Паводле закону, усе заявы на заснаванне аб’яднанняў і рэспубліканскіх аб’яднанняў падаюцца ў КСРН.

Закон, апроч таго, патрабуе перарэгістрацыі ўсіх рэлігійных груп, якія былі зарэгістраваны да ўступлення ў сілу новага закону аб рэлігіі. Хоць парадак перарэгістрацыі дакладна не вызначаны ў законе, на практыцы ён аналагічны агульнаму парадку рэгістрацыі. Раней зарэгістраваныя рэлігійныя суполкі могуць перарэгістравацца, маючы ў сваім складзе сама меней 10 членаў, у адрозненне ад колькасці ў 20 членаў, неабходнай для рэгістрацыі новай суполкі.

Паводле звестак КСРН, за чэрвень бягучага года 80 працэнтаў раней зарэгістраваных рэлігійных суполак прайшлі перарэгістрацыю. Гэта сведчыць, што паспяхова перарэгістравалася 95 працэнтаў праваслаўных і каталіцкіх абшчын, 80 працэнтаў іудзейскіх, 70 працэнтаў пратэстанцкіх, 54 працэнты грэка-каталіцкіх і 50 працэнтаў крышнаіцкіх суполак. КСРН паведаміў, што адзінай групай, якой было адмоўлена ў рэгістрацыі за ўвесь перыяд, які ахопліваецца гэтый справаздачай, засталася мусульманская суполка, што не выканала патрабавання аб мінімальнай колькасці членаў рэлігінай групы. Адмова не была абскарджана ніводнай з дзвюх галоўных беларускіх мусульманскіх арганізацый. Вернікі грэка-каталіцкай царквы паведамлялі, што яшчэ і да чэрвеня службовыя асобы на мясцовым узроўні перашкаджалі перарэгістрацыі грэка-каталіцкіх суполак.

Канкардат, заключаны паміж БПЦ і ўрадам, гарантуе БПЦ самастойнасць у яе унутраных справах і магчымасць карыстацца ўсімі сваімі рэлігійнымі правамі, таксама як і права лічыць сябе ў асаблівых адносінах з дзяржавай. Пагадненне прызнае за БПЦ «уплыў на фарміраванне духоўных, культурных і нацыянальных традыцый беларускага народа». Канкардат заклікае ўрад і БПЦ да супрацоўніцтва пры правядзенні сваёй палітыкі ў розных сферах, уключна з асветай, развіццём і аховай культурнай спадчыны, а таксама бяспекай. Хоць у дакуменце сцвярджаецца, што пагадненне не замахваецца на рэлігійныя свабоды іншых канфесій, ён у той жа час заклікае ўрад і БПЦ аб’явіць вайну неназваным «псеўда-рэлігійным структурам, якія ўяўляюць небяспеку для асобы і грамадства». За справаздачны перыяд БПЦ падпісала пагадненні аб супрацоўніцтве з Міністэрствамі аховы здароўя, працы, па надзвычайных сітуацыях, культуры, абароны, асветы, спорту і турызму, а таксама з Акадэміяй Навук.

У сакавіку гэтага года Нацыянальны цэнтр інтэлектуальнай уласнасці прадаставіў БПЦ выключнае права на выкарыстанне слова «праваслаўны» ў яе назве і выключнае права на выкарыстанне выявы Крыжа Ефрасінні Полацкай, святой заступніцы Беларусі, у якасці свайго сімвала. Гэтыя крокі можна лічыць дадатковым сродкам умацавання становішча БПЦ як адзінай праваслаўнай веры, якая мае права на існаванне ў Беларусі. Такія рашэнні яшчэ больш абмяжоўюць магчымасць існавання ў краіне іншых праваслаўных рэлігій, якія не знаходзяцца пад юрысдыкцыяй Масквы, такіх як БАПЦ і Сапраўдная праваслаўная вера.

Улады лічаць усе групы, якія, па іх меркаванню, не адносяцца да «традыцыйных» рэлігій, «нетрадыцыйнымі», прычым службовыя асобы і дзяржаўныя СМІ ў дачыненні да апошніх шырока выкарыстоўваюць тэрмін «секта», хоць ён і не з'яўляецца афіцыйным абазначэннем. Урад увогуле мяркуе, што пратэстанцкія групы з'яўляюцца нетрадыцыйнымі і разглядае некаторыя з іх як секты. На студзень гэтага года было зарэгістравана 27 рэлігій і 2863 рэлігійныя абшчыны: 1290 – Беларускай праваслаўнай царквы, 566 хрысціян-евангелістаў, 432 рымска-каталіцкай царквы, 270 баптысцкіх, 63 адвентыстаў сёмага дня, 43 іудзейскіх, 27 мусульманскіх і 13 грэка-каталіцкіх. Гэтая колькасць таксама ўключае і суполкі, прыналежныя да некаторых іншых рэлігійных кірункаў. Некаторыя суполкі зарэгістраваны толькі на мясцовым узроўні, што абмяжоўвае іх правы, бо толькі рэлігійным арганізацыям, зарэгістраваным на агульнанацыянальным узроўні, дазваляецца запрашаць замежных рэлігійных дзеячоў і адкрываць новыя цэрквы. Хоць ад выплаты падаткаў вызваляюцца ўсе зарэгістраваныя рэлігійныя арганізацыі, дзяржбюджэтныя субсідыі паступаюць толькі на адрас БПЦ. Пратэстанцкія групы паведамляюць, што падатковыя органы пастаянна абкладаюць іх штрафамі за нявыплату падаткаў з тае дапамогі, якую яны аказваюць малазабяспечаным сем'ям і пэўным асобам. Дзяржаўным служачым не рэкамендуецца прымаць любыя рэлігійных зарокі ці выкарыстоўваць атрыбуты якой-небудзь канкрэтнай веры.

Паводле прынятай у 2001 годзе пастановы, урад патрабуе, каб запрашаючая арганізацыя падавала пісьмовую заяўку на запрашэнне ў краіну замежнага святара з указаннем часу знаходжання і мэты візіту. Нават калі візіт мае нерэлігійны характар і звязаны, напрыклад, з дабрачыннай дзейнасцю, прадстаўнік павінен атрымаць візу і дазвол у КСРН. Камітэту даецца 20 дзён для адказу, прычым абскарджанне яго рашэння не прадугледжваецца. Заканадаўства забараняе ў краіне «падрыўную дзейнасць» замежных арганізацый і накладае забарону на стварэнне аддзелаў замежных арганізацый, дзейнасць якіх узбуджае «нацыянальную, рэлігійную і расавую

варожасць» або можа «аказаць негатыўны ўплыў на фізічнае і духоўнае здароўе народа».

**Абмежаванні свабоды веравызнання**

Дзяржава ўзмацняла пераследаванні рэлігійных груп, зыходзячы пры гэтым не толькі з закону аб рэлігіі, але і з указанняў, што прад'яўляюць да рэлігійных груп дадатковыя правілы і патрабаванні, адсутныя ў законе.

Паводле афіцыйнай статыстыкі, за першае паўгоддзе 2004 года КСРН зарэгістраваў 38 новых рэлігійных суполак, з якіх 7 – пратэстанцкія, а таксама 9 рэлігійных арганізацый. Аднак у перыяд, ахоплены гэтай справаздачай, Камітэт працягваў адтэрміноўваць рэгістрацыю Царквы саенталогіі. Напрыканцы справаздачнага перыяду пакуль што незарэгістраваная БАПЦ рыхтавалася падаваць дакументы на рэгістрацыю.

Згодна са службай навін «Форума-18», 23 кастрычніка ў сувязі з «грубымі парушэннямі" закону «пераважна пратэстанцкімі суполкамі» ў г. Нясвіжы і з-за неабходнасці актывізаваць намаганні мясцовых службовых асоб па "ўрэгуляванні этна-канфесійнай сітуацыі» Уладзімір Ламека, намеснік старшыні КСРН, загадаў мясцовым уладам узмацніць кантроль за дзейнасцю рэлігійных арганізацый, рэгулярна наведваць набажэнствы і сустракацца з рэлігійнымі лідэрамі, а таксама пастаянна кантраляваць і перарываць дзейнасць незарэгістраваных рэлігійных груп. Акрамя таго, сп. Ламека даў указанне мясцовым службовым асобам не дазваляць асноўнай арганізацыі польскай меншасці ў краіне выкарыстоўваць маёмасць, якая належыць рымска-каталіцкаму касцёлу, і праводзіць «сістэматычную работу» з мясцовымі каталіцкімі лідэрамі дзеля таго, каб замежныя каталіцкія рэлігійныя дзеячы чыталі свае казані на беларускай або рускай мове. Пасля такіх распараджэнняў з боку сп. Ламекі прадстаўнікі суполак Евангелісцкага саюза веры хрысціянскай і баптыстаў скардзіліся, што школьныя настаўнікі пачалі апытваць дзяцей, якія належаць да гэтых цэркваў, пра іх удзел у рэлігійных абрадах з мэтай выяўлення тых школьнікаў, што маюць дачыненне да пратэстанцкай рэлігійнай дзейнасці.

Некаторыя рэлігійныя групы, як афіцыйна зарэгістраваныя, так і не, сутыкаліся з праблемамі пры арэндзе ці набыцці маёмасці, неабходнай для абсталявання месцаў набажэнства, мелі цяжкасці пры збудаванні цэркваў (у прыватнасці, грэка-каталіцкія і пратэстанцкія групы) або адкрытым навучанні святароў.

Тэарэтычна грамадзянам не забараняецца схіляць іншых асоб у сваю веру, і яны могуць адкрыта выказвацца пра свае рэлігійныя перакананні; аднак улады часцей намагаюцца што-небудзь забараніць, умяшацца або пакараць пэўных асоб, якія агітуюць ад імя сваёй зарэгістраванай ці незарэгістраванай рэлігіі. Урад працягваў ажыццяўленне пастановы Савета Міністраў ад 1995 года, якая рэгулюе дзейнасць рэлігійных работнікаў. Пастанова Савета Міністраў ад 1997 года дазваляе зарэгістраваным рэлігійным групам выкладанне рэлігіі ў моладзевых лагерах.

Замежныя місіянеры не маюць права займацца рэлігійнай дзейнасцю па-за сценамі ўстаноў, якія іх запрасілі. Закон патрабуе, каб такія дзеячы мелі на руках гадавыя візы на шматразовы ўезд з дазволам на заняцце «духоўнай дзейнасцю». Паводле звестак КСРН, у 2003 годзе беларускія рэлігійныя аб'яднанні запрасілі 956 замежных рэлігійных работнікаў, з іх 254, якія прыязджалі спецыяльна для ўдзелу ў рэлігійнай дзейнасці. Але і пры такіх паказчыках рэлігійныя групы, нават тыя, якія даўно існуюць у краіне, па-ранейшаму маюць цяжкасці пры атрыманні візаў. Ад часу свайго адраджэння ў 1991 годзе рымска-каталіцкая царква адчувае недахоп кваліфікаваных мясцовых святароў. Час ад часу царква сутыкаецца са складанасцямі пры атрыманні дазволу ад улад на запрашэнне дастатковай колькасці замежных рэлігійных работнікаў, у асноўным з Польшчы, для ліквідацыі гэтага недахопу. Члены суполкі Харэ Крышна па-ранейшаму скардзяцца на тое, што дзеючае заканадаўства не дазваляе ім запрашаць замежных святароў для ўдзелу ў рэлігійнай дзейнасці сваёй групы, і нават не падаюць заяўкі на прыезд да іх у краіну іншаземцаў.

Дзякуючы пагадненню, дасягнутаму з рознымі дзяржаўнымі ўстановамі, БПЦ, па наяўных звестках, мае магчымасць карыстацца льготнымі стаўкамі падаткаў на зямлю і маёмасць, што не заўсёды даступна для іншых рэлігій. Пратэстанцкія суполкі паведамлялі, што іх царква можа страціць свае належныя льготы па падатках на зямлю і маёмасць, калі здасць сваю вольную маёмасць у арэнду іншым суполкам, якія маюць дачыненне да іх веры. Наяўнасць арэнднага пагаднення з'яўляецца абавязковай умовай атрымання юрыдычнага адраса і дае магчымасць падаць у далейшым на рэгістрацыю ў якасці рэлігійнай групы ці царквы. Аналагічным чынам пратэстанцкія цэрквы, у адрозненне ад БПЦ, страчвалі свае льготы па падатках на зямлю і маёмасць, калі ў межах аднаго і таго ж аб'екта ўласнасці адна побач з адной ставіліся пабудовы, звязаныя з гэтай царквой.

Паводле звестак БАПЦ, мясцовыя ўлады пасёлка Прымор'е Мінскай вобласці забаранілі двум святарам БАПЦ прыязджаць у пасёлак пасля таго, як яны незаконна правялі там набажэнствы. Атрыманне дазволу на прыезд замежнага прапаведніка або

рэлігійных работнікаў часта звязана з працяглай бюракратычнай працэдурай. Органы ўнутраных спраў могуць выслаць замежных святароў з краіны, адмовіўшы ім у падаўжэнні рэгістрацыі або не выдаючы дазвол на часовы побыт. Гэтыя ўлады маюць права прымаць рашэнне аб высылцы паводле ўласнага меркавання ці на аснове рэкамендацый Саветаў па справах рэлігій пры аблвыканкамах або Управы па справах рэлігій Мінгарвыканкама.

Пачынаючы з красавіка 2003 года ўлады Гродна неаднаразова адмаўлялі ў рэгістрацыі равіну-іншаземцу з-за таго, што ён не размаўляе ні па-беларуску, ні па-руску.

Як інфармуе ўрад, закон дазваляе выкарыстоўваць жылую ўласнасць для рэлігійнага служэння пасля яе вывядзення з жылога фонду. Жыллёвы кодэкс дапускае выкарыстанне такой уласнасці па іншым прызначэнні з дазволу мясцовых выканаўчых і адміністрацыйных органаў. Мясцовыя ўлады ажыццяўляюць гэтае заканадаўчае патрабаванне з 2000 года, настойліва патрабуючы ад усіх рэлігійных арганізацый перарэгістрацыі сваёй уласнасці. Дзяржаўная статыстыка за 2002 год сведчыць, што 110 рэлігійных суполак, сярод іх 34 пратэстанцкія арганізацыі, перарэгістравалі сваю маёмасць па такой методыцы; аднак улады працягваюць адмаўляць у дазволе многім пратэстанцкім суполкам, а таксама іншым нетрадыцыйным рэлігіям, якія апынуліся фактычна ў замкнёным коле. Ім не даюць дазвол на выключэнне сваёй уласнасці з жыллёвага фонду для выкарыстання ў рэлігійных мэтах, таму што гэтыя аб'яднанні не з’яўляюцца зарэгістраванымі рэлігійнымі групамі. Але ж рэлігійная арганізацыя павінна мець юрыдычны адрас дзеля таго, каб падаваць на рэгістрацыю. Рэлігійныя групы, якія не могуць зарэгістравацца, часта вымушаны сустракацца нелегальна або дома ў сваіх асобных членаў.

Згодна са звесткамі КСРН, у 2003 годзе налічвалася 227 пабудоў, прызначаных для рэлігійных мэт, сярод іх 42 будынкі пратэстантаў. Аднак за справаздачны перыяд многія традыцыйныя і нетрадыцыйныя рэлігійныя групы па-ранейшаму мелі праблемы пры набыцці ўласнасці з-за таго, што ўлады рабілі спробы перашкодзіць гэтым групам у стварэнні сваіх культавых месцаў. У снежні гарадскія ўлады Слоніма аказалі ўсціск на дырэктара мясцовага Палаца культуры дзеля таго, каб ён скасаваў арэндную дамову, заключаную ім з Царквой Поўнага Евангелля Новага Пакалення.

У той час як пратэстанты і грэка-каталікі сведчаць, што ім стала нашмат лягчэй, чым у папярэднія гады, арэндаваць памяшканні для рэлігійнай службы ў Дамах і Палацах культуры, прадстаўнікі нетрадыцыйных рэлігійных груп, як і раней, атрымліваюць адмовы ў прадастаўленні памяшканняў для рэлігійнага прызначэння. Паводле звестак

Аб’яднання Хрысціян Поўнага Евангелля, за разгледжаны гэтай справаздачай перыяд мінскія ўлады адхілілі не менш як пяць заяў ад гэтай царквы на арэнду памяшканняў у адным з мясцовых грамадскіх будынкаў. За гэты ж перыяд, і апошнім разам у чэрвені, пратэстанты накіравалі мноства запытаў у КСРН наконт дазволу арэндаваць уласнасць для набажэнстваў. У сваіх адказах Камітэт патлумачаў, што толькі мясцовыя ўлады маюць права вырашаць, даваць такі дазвол ці не.

У 2003 годзе мясцовыя ўлады анулявалі раней прынятае рашэнне пра выдзяленне ўласнасці групе пяцідзесятнікаў у пасёлку Дружны, заявіўшы, што група павінна напачатку высветліць грамадскае меркаванне жыхароў населенага пункта. Абласныя ўлады адмянілі гэтую ўмову, і тады мясцовыя ўлады прапанавалі суполцы тры надзелы зямлі на выбар. Улады па-ранейшаму не даюць дазвол на ўзвядзенне ў Мінску свайго культавага будынка зарэгістраванай Евангелісцкай Царкве Новага Жыцця, якая мела намер пабудаваць спачатку царкву, а затым грамадскі цэнтр, але не змагла зрабіць ні таго, ні іншага.

У лютым у цэнтры Мінска пачалася адбудова мячэці, дашчэнту разбуранай у савецкія часы. Заканчэнне работ плануецца на 2005 год.

У 2002 годзе мясцовыя ўлады гарадскога пасёлка Бараўляны Мінскай вобласці адмовілі ў дазволе зарэгістраванай суполцы Поўнага Евангелля пераабсталяваць прыватны дом пад царкву. Нягледзячы на тое, што суполка атрымала ўсе належныя дазволы ад мясцовых улад, орган па рэлігійных справах катэгарычна адмовіў ёй у дазволе. Чыноўнікі КСРН пры гэтым спасылаліся на напісанае шэрагам праваслаўных жыхароў пасёлка пісьмо са скаргамі на тое, што члены суполкі Поўнага Евангелля незаконна пранікаюць у хаты з мэтай схілення грамадзян у сваю веру, выкрадаюць праваслаўныя крыжыкі у тых, хто іх носіць. Па іх меркаванні, гэта не суполка, а незарэгістраваная «секта». Па наяўных звестках, гэтае пісьмо было складзена мясцовым святаром БПЦ. Нягледзячы на калектыўны зварот да Генеральнага пракурора з просьбай прадставіць доказы па гэтых абвінавачваннях, ніякага расследавання праведзена не было. Па стане на чэрвень КСРН усё яшчэ не даў дазволу на адкрыццё царквы.

За разгледжаны гэтай справаздачай перыяд не мелася паведамленняў ад рэлігійных груп пра выпадкі высялення з памяшканняў; аднак улады, як і раней, спынялі несанкцыянаваныя рэлігійныя сходы на кватэрах.

Пастанова ўрада прадугледжвае канкрэтныя меры па забеспячэнню грамадскага парадку і бяспекі пры правядзенні масавых грамадскіх мерапрыемстваў, што і

скарысталі дырэктары некаторых клубаў і дамоў культуры дзеля таго, каб скасаваць арэндныя дамовы з рэлігійнымі групамі на выкарыстанне сваіх аб'ектаў або адмовіць у іх падаўжэнні. Паводле інфармацыі службы навін «Форума-18», у сакавіку мінскія гарадскія ўлады адхілілі заяўку кальвініscцкай рэфарматарскай царквы на правядзенне міжнароднай канферэнцыі, прысвечанай 450-ай гадавіне заснавання царквы ў краіне. Паводле наяўных звестак, мінскія гарадскія ўлады паведамілі царкве аб тым, што яна не мае права праводзіць міжнародную канферэнцыю, паколькі арганізацыя не зарэгістравана як рэспубліканскае рэлігійнае аб'яднанне, нават нягледзячы на тое, што закон аб рэлігіі дазваляе рэлігійным арганізацыям запрашаць іншаземцаў для ўдзелу ў сходах, паломніцтвах і іншай дзейнасці.

Нягледзячы на свой афіцыйна зарэгістраваны статус, грэка-каталіцкая царква сутыкаецца з праблемамі ў паразуменні з урадам па прычыне яе спрадвечна напружаных адносін з праваслаўнай царквой і падкрэсленага выкарыстання беларускай мовы. Хоць грэка-каталіцкая царква і сцвярджае, што цяпер стала лягчэй, чым у мінулыя гады, арэндаваць уласнасць для набажэнстваў, аднак магчымасці для рэгулярнага правядзення набажэнстваў у такіх памяшканнях стрымліваюцца вялікімі фінансавымі выдаткамі на атрыманне патрэбных дазволаў.

Хоць паведамленняў пра антыпратэстанцкія публікацыі ў дзяржаўных СМІ не мелася, гэтыя выданні працягвалі свае выпады супраць іншых нетрадыцыйных вераванняў. У выпуску газеты «Знамя юности» ад 16 красавіка быў апублікаваны артыкул пад назвай «Хіба так можна выратаваць душу?», у якім расказвалася пра дзейнасць дэструктыўных сект у Беларусі. Як сведчыць гэты артыкул, у краіне на сённяшні час дзейнічаюць каля 370 «сект»; сярод самых «небяспечных» з іх былі названы Царква Аб'яднання, «Царква Хрыстова» і Царква саенталогіі.

Артыкул у нумары дзяржаўнай газеты «Минский курьер» ад 26 сакавіка ўтрымліваў крытыку прыхільнікаў Царквы уніфікацыі і Харэ Крышны. У артыкуле сцвярджалася, што яшчэ ў 1997 годзе Харэ Крышна была вызначана як «дэструктыўная таталітарная секта». Як паведамілі прадстаўнікі суполкі Харэ Крышна, улады ніколі не давалі такога вызначэння. Падчас сустрэчы з крышнаітамі аўтар-журналіст прызнаўся, што такія лжывыя звесткі былі прадстаўлены беларускім КДБ, што пазней пацвердзіў і сам беларускі КДБ.

У сакавіку 2003 года Міністэрства асветы выпусціла падручнік пад назвай «Религиоведение», прызначаны для рэлігійнай асветы насельніцтва, у якім рэлігійныя кірункі Харэ Крышна, хрысціян-евангелістаў і саентолагаў вызначаліся як «неакульты»

і «секты». Хоць падручнік і заставаўся ў абарачэнні на працягу ўсяго справаздачнага перыяду, не паступіла ніякіх паведамленняў аб негатыўным уплыве на вучняў, якія прытрымліваюцца памянёных рэлігій. Другі падручнік, «Человек, общество, государство», які развівае аналагічныя ідэі, таксама нязменна выкарыстоўваецца ў школах Беларусі. Пасля адпаведнага аналізу зместу абодвух навучальных дапаможнікаў КСРН і Міністэрства асветы зрабілі выснову, што слова «секта» з’яўляецца «навуковым» тэрмінам і не навешвае на Харэ Крышну ці пратэстантаў ярлык антыграмадскіх арганізацый.

На працягу ўсяго справаздачнага перыяду працягваўся продаж і распаўсюджанне антысеміцкай літаратуры як праз дзяржаўную сетку распаўсюджвання перыёдыкі і дзяржаўныя ўстановы, так і праз кіёскі і мерапрыемствы, датычныя дзейнасці БПЦ.

Насуперак выдадзенаму ў траўні 2003 года загаду Генеральнага пракурора і міністра інфармацыі аб канфіскацыі з продажу антысеміцкай і ксенафобскай газеты «Русский вестник», яе распаўсюджванне ўзнавілася ў лютым гэтага года праз дзяржаўнае агенцтва «Белсаюздрук». Як і ў мінулыя гады, антысеміцкую літаратуру працягвалі прадаваць у фае Нацыянальнай Акадэміі Навук.

Антысеміцкую літаратуру адкрыта прапаноўвалі і падчас правядзення ў Мінску некалькіх праваслаўных кніжных кірмашоў, і ў доме-прытулку, мінскім хоспісе, заснаваным па ініцыятыве БПЦ. А прадстаўнікі рымска-каталіцкай царквы паведамлялі, што антыкаталіцкая літаратура таксама прадаецца ў месцах, звязаных з БПЦ. Антысеміцкія і рускія ультранацыяналістычныя газеты і літаратуру прадавалі і прадаюць у кнігарні «Православная книга», прызначаным для продажу праваслаўнай літаратуры і рэлігійных атрыбутаў. Хоць гэтыя выданні і маюць расійскае паходжанне, многія іх экземпляры былі перадрукаваны беларускімі выдавецтвамі. «Православная книга» таксама распаўсюджвала антысеміцкую літаратуру 25 кастрычніка пры правядзенні з’езда Усебеларускага аб’яднання казакаў. У адказ на патрабаванне групы яўрэяў пакараць «Православную книгу», Генеральны пракурор загадаў пачаць расследаванне гэтага інцыдэнту, каб выявіць факт незаконнага распаўсюджвання «Православной книгой» літаратуры, што спараджае нацыянальную нецярпімасць. Паводле звестак, на чэрвень не было вынесена ніякага рашэння. І хоць БПЦ заяўляла, што не падтрымлівае ніякіх сувязяў з «Православной книгой», самі супрацоўнікі кнігарні пацвярджалі, што «Православная книга» з’яўляецца афіцыйнай крамай БПЦ.

Паводле сведчання рымска-каталіцкай царквы, у красавіку святары БПЦ дапусцілі некалькі антыкаталіцкіх выказванняў падчас святкавання праваслаўнага Вялікадня,

якое транслявалася па агульнанацыянальным тэлебачанні. Рымска-каталіцкая царква, акрамя таго, выказвала занепакоенасць фактамі продажу антыкаталіцкай літаратуры ў кіёсках і на мерапрыемствах, якія маюць дачыненне да БПЦ.

Нягледзячы на распачатае расследаванне дзейнасці кнігарні «Православная книга» і запэўненні шмат якіх дзяржаўных чыноўнікаў у тым, што гандаль такой літаратурай з’яўляецца незаконным, урад не зрабіў ніякіх сур'ёзных захадаў па спыненні гандлю ксенафобскай літаратурай у «Православной книге» і іншых месцах.

За справаздачны перыяд рэстытуцыя рэлігійнай уласнасці праводзілася ў абмежаваных маштабах. Для рэстытуцыі ўласнасці, захопленай ці экспрапрыяванай пры саветах і падчас нацысцкай акупацыі, не існуе заканадаўчай базы, больш за тое, закон абмяжоўвае рэстытуцыю ўласнасці, якая выкарыстоўваецца для мэт культуры і асветы. Многія былыя сінагогі ў Мінску перароблены пад тэатры, музеі, спартыўныя комплексы, а адна нават пад піўны зал; на большасць просьбаў яўрэйскай супольнасці вярнуць гэтыя сінагогі прыходзіла адмова. Нешматлікія выпадкі вяртання ўласнасці рэлігійным суполкам носяць адзінкавы і непаслядоўны характар, прычым мясцовыя афіцыйныя органы звычайна вельмі неахвотна ідуць на супрацоўніцтва. За некалькі апошніх гадоў рэлігійным групам удалося паспяхова пралабіраваць вяртанне ўладамі некаторых аб’ектаў уласнасці ў Мінску і іншых гарадах.

Як пацвярджае КСРН, рэлігійным арганізацыям прадастаўляецца пераважнае права на вяртанне аб’ектаў рэлігійнай уласнасці, апроч тых выпадкаў, калі яны выкарыстоўваюцца для культурных і спартыўных мэт. Афіцыйная статыстыка сведчыць, што за 1988 – 2003 гады дзяржава вярнула больш як 1120 збудаванняў, якія некалі належалі розным рэлігійным групам, у тым ліку 709 – БПЦ, 292 – суполкам рымска-каталіцкай царквы, 29 – стараверам, 12 – іудзеям, 7 – пратэстанцкім суполкам, 3 – мусульманам і 1 – грэка-каталіцкай царкве. Аднак не было паведамленняў пра тое, каб урад вярнуў якую-небудзь рэлігійную ўласнасць былым гаспадарам на працягу разгледжанага гэтай справаздачай перыяду.

Насуперак выказанаму ў кастрычніку 2003 года прэзідэнтам Лукашэнка ўказанню аб тым, каб урад не перашкаджаў дзейнасці яўрэйскай супольнасці, чыноўнікі па-ранейшаму прадпрымалі захады, якія сведчылі пра недастатковую ўвагу да пытанняў, што хвалююць яўрэйскую супольнасць у Беларусі. У Гродна працягваліся будаўнічыя работы на стадыёне, закладзеным у 1950-я гады на месцы былых яўрэйскіх могілак, якія існавалі там з XVII стагоддзя. У ходзе земляных работ будаўнікі натыкаліся на чалавечыя рэшткі, якія вывозіліся з аб’екта для перазахавання. На фатаграфіях,

зробленых прадстаўнікамі яўрэйскай абшчыны, былі бачныя чалавечыя рэшткі не толькі ў грунце, што высыпаўся экскаватарам у самазвалы, але і ў той зямлі з аб’екта, якая ішла на аднаўленне дарожнага насыпу. І толькі пасля інтэнсіўнага міжнароднага націску губернатар Гродзенскай вобласці Уладзімір Саўчанка падпісаў у жніўні 2003 года пагадненне з лідэрам беларускай яўрэйскай супольнасці, дзе прадугледжвалася неадкладнае прыпыненне земляных работ, але дапускаўся працяг агульнай будоўлі на аб’екце. У лістападзе 2003 года Саўчанка падпісаў яшчэ адно пагадненне з іншым лідэрам беларускай яўрэйскай супольнасці, у якім прадугледжвалася выманне рэштак пахаваных з дарожнага насыпу і неадкладнае спыненне земляных работ на могілках. Нягледзячы на тое, што абодва пагадненні прадпісвалі спыненне земляных работ на стадыёне, такія работы працягваліся. У сярэдзіне чэрвеня гродзенская гарадская супольнасць паведамляла, што хоць земляныя работы на стадыёне завершаны, будоўля ідзе поўным ходам.

У 2002 годзе ўлады Магілёва вырашылі змяніць статус гарадскіх яўрэйскіх могілак, атрыманы імі ў 2001 годзе, зрабіўшы іх агульнымі. Згодна з пагадненнем 2001 года магілёўскія пахавальныя службы павінны былі выдзеліць зямлю для пашырэння могілак і не дапускаць пахаванняў на яўрэйскіх участках без узгаднення з мясцовай яўрэйскай супольнасцю. Насуперак падпісанаму пагадненню, мясцовыя ўлады дазвалялі прыбіраць рэшткі і зносіць надмагільныя камяні, каб даць месцы для пахавання асоб неяўрэйскай нацыянальнасці. Рэшткі пахаваных, знойдзеныя пры капанні магіл, пакідаліся тут жа на зямлі. У чэрвені 2003 года мясцовая яўрэйская супольнасць накіравала прэзідэнту Лукашэнка просьбу спыніць такую практыку. У лютым губернатар Магілёўскай вобласці вярнуў могілкам статус яўрэйскіх і абавязаў пахавальную службу і гарадскога мэра выконваць пагадненне 2001 года. Не зважаючы на гэта, як сведчыць мясцовая супольнасць, па стане на чэрвень мэр усё яшчэ не выканаў гэты загад, спасылаючыся на тое, што Магілёўскі гарсавет быў на вакацыях напрыканцы разгледжанага гэтай справаздачай перыяду і не мог зацвердзіць выкананне загаду. У канцы чэрвеня мясцовае ўпраўленне па барацьбе з эканамічнай злачыннасцю, прымаючы меры па заяве мясцовай яўрэйскай супольнасці, распачала расследаванне законнасці некалькіх дазволеных на могілках пахаванняў. Па стане на 30 чэрвеня працягвалася і расследаванне, і знос надмагільных камянёў на месцы яўрэйскіх пахаванняў.

11 лютага па распараджэнні Міністэрства асветы Беларускі дзяржаўны універсітэт (БДУ) закрыў Міжнародны гуманітарны інстытут (МГІ), які з'яўляўся самастойнай установай пры БДУ і адзінай вышэйшай навучальнай установай, у якой выкладаўся іудаізм. Разнастайныя праграмы МГІ, у тым ліку і іудаізм, былі размеркаваны па

некалькіх факультэтах БДУ. Хоць рэктар БДУ і тлумачыць, што ліквідацыя МГІ праз яго размеркаванне з'яўляецца часткай унутранай рэарганізацыі навучальных праграм БДУ, некаторыя яўрэйскія групы выказвалі занепакоенасць тым, што закрыццё інстытута зроблена ў ходзе дзеянняў урада ў адказ на закрыццё ў жніўні 2003 года ізраільскай амбасады ў Мінску, а таксама з ініцыятывы мітрапаліта Філарэта, які, паводле звестак, быў супраць праграм вывучэння іудаізму. Па стане на травень праграмы МГІ па вывучэнню іудаізму ўсё яшчэ захоўваліся як частка вучэбнага плану БДУ, але цяпер ўжо без прывязкі да самастойнага інстытута.

За разгледжаны гэтай справаздачай перыяд службовыя асобы дзяржаўнага рангу час ад часу дапускалі публічныя антысеміцкія заявы. Так, паводле матэрыялаў артыкула агенцтва «Асашыэйтэд Прэс» за 13 верасня, Сяргей Касцян, намеснік старшыні камісіі па міжнародных справах ніжняй палаты парламента, адкінуў крытыку з прычыны пракладкі газапровада паблізу былых яўрэйскіх могілак у Мазыры, абвінаваціўшы яўрэйскіх лідэраў у распальванні «нацыянальнай варожасці». На кастрычніцкай прэс-канферэнцыі, паводле звестак, міністр інфармацыі Уладзімір Русакевіч сказаў, што Беларусь павінна жыць з Расіяй, як браты, але таргавацца, «як жыды».

У 2002 годзе ў Брэсце затрымалі 17-гадовага падлетка за апаганенне помніка ахвярам халакосту, але затым адпусцілі яго.

Паводле сведчання КСРН, сам Камітэт рэагуе на розныя публічныя праявы ксенафабіі, уведамляючы пры гэтым адпаведныя дзяржаўныя органы, абавязаныя ўзбуджаць судовыя справы ў дачыненні асоб, якія іх дапусцілі; аднак за разгледжаны гэтай справаздачай перыяд падобных іскаў не фіксавалася.

**Замахі на свабоду веравызнання**

За справаздачны перыяд урад часта прымаў меры, якія абмяжоўвалі свабоду веравызнання некаторых рэлігійных груп.

Некалькі пратэстантаў былі аштрафаваныя за незаконнае правядзенне і прадастаўленне памяшканняў для рэлігійных служб. Згодна са звесткамі КСРН, асуджэнне за такія правапарушэнні грунтавалася на абвінавачаннях у парушэнні грамадскага парадку або ў незаконных сходах без атрымання папярэдняга дазволу. Закон дазваляе грамадзянам збірацца для малітвы ў прыватных жыллёвых памяшканнях, але ён накладае абмежаванні на выкананне рытуалаў, абрадаў ці правядзенне цырымоній у такіх месцах

і патрабуе атрымання папярэдняй згоды ад мясцовых улад на правядзенне гэтых мерапрыемстваў.

17 красавіка мазырскі суд аштрафаваў Леаніда Мартыновіча, Міхаіла Крынца і Васіля Біласа, трох членаў незарэгістраванага Міжнароднага саюза баптысцкіх цэркваў (МСБЦ), на 176 долараў ЗША (380 000 рублёў) кожнага пасля таго, як яны павіншавалі пацыентаў мясцовай бальніцы з Вялікаднем.

23 лістапада 2003 года мясцовая міліцыя горада Навагрудка абвінаваціла Юрыя Дзянішчыка, місіянера Навагрудскай асацыяцыі баптыстаў, у тым, што ён незаконна праводзіў малітоўную службу ў прыватным доме, зарэгістраваным на імя Асацыяцыі. Падчас вобыску, зробленага ў доме, мясцовы чыноўнік абвінаваціў Дзянішчыка ў прыналежнасці да «фашысцкай секты». Пазней Дзянішчык быў аштрафаваны прыблізна на 15 долараў ЗША (33 000 рублёў).

5 снежня 2003 года, як паведамляла служба навін «Форума-18», Віктар Еўцюхаў, член МСБЦ, быў аштрафаваны на суму каля 40 долараў ЗША (82 500 рублёў) за правядзенне незарэгістраванай рэлігійнай цырымоніі ў населеным пункце Замошша. 23 снежня Алег Курносаў, таксама член МСБЦ, быў аштрафаваны на суму каля 8 долараў ЗША ( 16 500 рублёў) за ўдзел у аналагічнай дзейнасці ў пасёлку Дуброўна. У лютым яшчэ адзін святар МСБЦ атрымаў папярэджанне за правядзенне рэлігійных службаў у горадзе Салігорску. Гэтай групе было прапанавана спыніць з 1 сакавіка ўсякую незаконную рэлігійную дзейнасць.

Рэжым працягваў праследаваць членаў БАПЦ. 20 чэрвеня гэтага года службовыя асобы Мінскай вобласці і КСРН, згодна з наяўнымі звесткамі, папярэдзілі мясцовага святара БАПЦ аб тым, што ён павінен спыніць свае спробы ўзнавіць будынак былой царквы БАПЦ у населеным пункце Сёмкаў Гарадок.

За справаздачны перыяд улады па-ранейшаму праследавалі, штрафавалі і затрымлівалі прыхільнікаў Харэ Крышны за незаконнае распаўсюджванне рэлігійнай літаратуры. Група паведамляла, што ўлады працягваюць дэпартаваць крышнаітаў-іншаземцаў, якіх затрымала міліцыя ў час распаўсюджвання сваёй рэлігійнай літаратуры ў Беларусі, нібыта за якіясьці візавыя парушэнні. На працягу ўсяго ахопленага справаздачай перыяду мінскія ўлады пастаянна адмаўлялі крышнаітам у просьбе даць дазвол на распаўсюджванне ў горадзе сваіх рэлігійных матэрыялаў.

Пад непасрэдным усціскам уладаў і з-за пастаянных праследаванняў рэлігійных арганізацый БАПЦ прыналежныя да іх святар Ян Спасюк і кіраўнікі групы «Святло Кайласа» Сяргей і Таццяна Акаданавы былі змушаны пакінуць краіну. Акрамя Акаданавых, шэрагу іншых членаў групы давялося таксама выехаць за мяжу ў сувязі з няспынным усціскам з боку ўладаў. Пасля ад'езду членаў групы і з-за пастаяннага страху перад праследаваннямі група «Святло Кайласа» афіцыйна самараспусцілася ў перыяд, ахоплены дадзенай справаздачай.

На працягу 2003 года члены групы «Святло Кайласа», аштрафаваныя за ўдзел у несанкцыянаваных дэманстрацыях і акцыях пратэсту, паведамлялі, што ўлады пагражаюць ім канфіскацыяй маёмасці і дадатковымі судовымі санкцыямі, калі штрафы не будуць заплочаны. Улады, апроч таго, папярэджвалі, пагражалі і праследавалі членаў іх сем'яў, патрабуючы аплаты. У сакавіку 2003 года ўлады прымусілі бацькоў аднаго з членаў групы заплаціць штраф за свайго сына. Члены групы «Святло Кайласа» сведчылі пра тое, што іх звальнялі з працы толькі з-за таго, што яны з'яўляюцца прыхільнікамі гэтага рэлігійнага кірунку. Адна з членаў паведамляла, як была аштрафаваная за тое, што з'яўляецца «сектанткай» і паслядоўніцай «культу». Мясцовыя службовыя асобы даводзілі супрацоўнікам адной кампаніі, што яна будзе закрыта з-за таго, што яе дырэктар належыць да такой групы.

5 жніўня 2003 года мінскія гарадскія ўлады папярэдзілі Царкву новага жыцця аб тым, каб яна спыніла правядзенне незарэгістраваных рэлігійных сходаў. Пра затрыманых вернікаў ці арышты паведамленняў не было.

**Прымусовы зварот у веру**

Не паступала паведамленняў ні пра прымусовы зварот у веру, ні пра непаўналетніх грамадзян ЗША, якія былі выкрадзены або незаконна вывезены са Злучаных Штатаў, ні пра адмову прадаставіць магчымасць такім грамадзянам вярнуцца ў Злучаныя Штаты.

**Пагрозы з боку тэрарыстычных арганізацый**

За справаздачны перыяд не паступала паведамленняў аб якіх-небудзь пагрозах з боку тэрарыстычных арганізацый у адрас канкрэтных рэлігій.

**Раздзел III. Адносіны ў грамадстве**

У цэлым прыязныя ўзаемаадносіны між рэлігіямі ў грамадстве садзейнічалі свабодзе веравызнання; аднак па-ранейшаму выяўляліся антысемітызм і адмоўнае стаўленне да рэлігійных меншасцяў. Згодна з апытаннем, праведзеным у кастрычніку 2002 года Незалежным інстытутам сацыяльных, эканамічных і палітычных расследаванняў, 57,7 працэнта рэспандэнтаў выказаліся за роўнасць розных рэлігійных груп, у той час як 33 працэнты апытаных меркавалі, што праваслаўная царква павінна мець асаблівыя дзяржаўныя прывілеі. Аднак другое апытанне, праведзенае той жа арганізацыяй у сакавіку, засведчыла, што толькі 32 працэнты рэспандэнтаў давяраюць рымска-каталіцкай царкве і ўсяго 13 – пратэстанцкім цэрквам.

Антысемітызм і крытычнае стаўленне да рэлігійных меншасцяў назіраліся на працягу ўсяго перыяду, які аналізуецца гэтай справаздачай. Яўрэйскія арганізацыі працягвалі крытыкаваць улады за нежаданне асудзіць антысеміцкія выказванні і заявы службовых асоб дзяржавы, спыніць продаж антысеміцкай літаратуры і абараніць могілкі і помнікі ахвярам халакосту. 27 жніўня 2003 года невызнаныя асобы кінулі запальную бомбу ў будынак мінскай сінагогі, нязначна пашкодзіўшы яго. Нягледзячы на праведзенае міліцэйскае расследаванне, зламыснікі не былі знойдзены. Два дэпутаты Палаты прадстаўнікоў, Валерый Фралоў і Уладзімір Парфяновіч, наведалі сінагогу на наступны дзень і асудзілі злачынны напад.

У сакавіку група маладзёнаў апаганіла і парушыла на бабруйскіх могілках дзесяць магіл, дзевяць з якіх былі яўрэйскімі. Падлеткі былі схоплены прахожымі і дастаўлены ў міліцыю. Аднак ім не было прад'яўлена ніякіх абвінавачанняў, і іх хутка адпусцілі. У чэрвені невядомыя нанеслі пашкоджанні некалькім яўрэйскім магілам на могілках у горадзе Чэрвені. 26 мая 2003 года невызнаныя асобы здзейснілі акты вандалізму на тэрыторыі мемарыяльнага комплексу ахвярам генацыду «Яма» ў Мінску і мемарыяла ў мястэчку Цімкавічы. У жніўні 2002 года невядомыя вандалы апаганілі такі ж мемарыял ахвярам генацыду ў Лідзе.

На працягу разгледжанага гэтай справаздачай перыяду невядомыя вандалы па-ранейшаму парушалі крыжы і знакі, як праваслаўныя, так і іншыя, устаноўленыя ў Курапатах на месцах, дзе агенты НКВД у 1930-я гады расстралялі больш як 300 тысяч чалавек. Улады не прадпрынялі ніякіх належных захадаў па вышуку тых злачынцаў.

Як падае КСРН, абласныя ўлады па ўсёй краіне прымаюць меры па папярэджанню вандалізму на могілках. Гэтыя меры прадугледжваюць устаноўку агароджаў вакол могілкаў, арганізацыю рэгулярнага патрулявання гэтых аб'ектаў сіламі мясцовых праваахоўных органаў, таксама збор і аналіз інфармацыі аб фактах вандалізму.

Яўрэйская супольнасць занепакоена распаўсюджваннем канцэпцыі «вялікага славянскага саюза», папулярнай сярод дзеючых у краіне нацыяналістычных арганізацый, такіх як Рускае нацыянальнае адзінства (РНА), якое ўсё яшчэ праяўляе актыўнасць, нягледзячы на афіцыйны роспуск у 2000 годзе, і Нацыянал-бальшавіцкая партыя, яшчэ адна руская экстрэмісцкая арганізацыя. У студзені члены РНА распаўсюджвалі антысеміцкую літаратуру ў гарадскіх аўтобусах Гомеля. Гэты інцыдэнт адбыўся ў тым жа месяцы, калі яўрэйскія абшчынныя цэнтры ў Гомелі і Полацку былі апаганены насценнымі надпісамі РНА. Улады пачалі расследаванні фактаў вандалізму.

У прааналізаваны гэтай справаздачай перыяд у Інтэрнэце з'явіўся вэб-сайт, які выдаецца за электронную старонку яўрэйскіх артадаксальных скінхэдаў (ЯАСХ), арганізацыі, якая нібыта складаецца з яўрэйскай моладзі, што вырашыла змагацца з антысемітызмам і ксенафабіяй. Насуперак заяўленым «арганізацыяй» мэтам, вэб-сайт заклікаў беларускіх яўрэяў да правакацыйных дзеянняў адносна ўрада ў барацьбе за сваю «справу» і ўтрымліваў зневажальныя выказванні пра неяўрэйскіх грамадзян Беларусі і вядомых кіраўнікоў беларускага яўрэйства. Некалькі яўрэйскіх лідэраў, якія палічылі вэб-сайт зняважлівым і правакацыйным, асудзілі яго і выказалі афіцыйным уладам сваю занепакоенасць. Вэб-сайт меў ссылку на іншы вэб-сайт, які нібыта падтрымліваецца скінхэдамі Харэ Крышны.

Афіцыйны беларускі праваслаўны малітоўны каляндар, надрукаваны ў Мінску, як і раней, адзначае 20 мая як гадавіну гібелі ў 1690 годзе Гаўрыіла Беластоцкага, малалетняга дзіцяці, якога яўрэі нібыта звялі са свету пад Гродна. Малітва за 20 мая, прысвечаная Беластоцкаму, называе яўрэяў «сапраўднымі звярамі», якія быццам бы выкралі і забілі Беластоцкага ў часе свайго рэлігійнага абраду.

У красавіку мясцовыя ўлады Брэсцкай вобласці адмовіліся ўзбудзіць крымінальнае расследаванне крадзяжу з узломам евангелісцкай хрысціянскай царквы ў пасёлку Хацілаў, які быў учынены ў сакавіку. Перад гэтым апошнім выпадкам, пачынаючы з 2000 года, як засведчана, гэтая царква шэсць разоў падвяргалася актам вандалізму.

За прааналізаваны гэтай справаздачай перыяд прадстаўнікі БАПЦ скардзіліся, што святары БПЦ у суправаджэнні чыноўнікаў Мінскай вобласці, праехаліся па некалькіх гарадах вобласці, заклікаючы мясцовых жыхароў не браць удзел у набажэнствах, праводзімых БАПЦ.

Няма ніякіх пацвярджэнняў таго, што БПЦ змяніла свой намер супрацоўнічаць толькі з тымі рэлігійнымі веравызнаннямі, якія маюць у краіне свае «гістарычныя карані». Члены большасці канфесій, не звязаных з БПЦ, выказалі сваё непрыманне закону аб рэлігіях і адкрыта крытыкавалі яго абмежаванні і расплывістасць. У ліпені 2003 года болей за 5000 пратэстантаў сышліся ў адным з мінскіх паркаў у знак нязгоды з прыняццем закону аб рэлігіях. Па стану на чэрвень большасць асноўных пратэстанцкіх груп, за выключэннем Аб'яднання Хрысціян Поўнага Евангелля, вырашылі падаць дакументы на перарэгістрацыю.

У сакавіку групы пратэстантаў накіравалі лісты прэзідэнту Лукашэнка, у Нацыянальны Сход і Канстытуцыйны суд з просьбай перагледзець абмежавальныя палажэнні закону аб рэлігіях. Канстытуцыйны суд, хоць і зазначыў, што рэлігійныя групы не маюць права звяртацца ў гэтую інстанцыю з падобным пытаннем, прызнаў усё ж, што некаторыя артыкулы закону патрабуюць далейшага стараннага вывучэння з мэтай выявіць парушэнні Канстытуцыі. Палата прадстаўнікоў – ніжняя палата Нацыянальнага сходу – адмовілася разглядаць просьбу, заявіўшы, што ўсе артыкулы закону аб рэлігіях з'яўляюцца канстытуцыйнымі, што, як бачна, пярэчыць каментару Канстытуцыйнага суда. Па стане на чэрвень прэзідэнт яшчэ не адрэагаваў на гэтыя і іншыя просьбы груп пратэстантаў аб пераглядзе закону.

На працягу справаздачнага перыяду ўрад па-ранейшаму праводзіў кампанію па замене старых беларускіх пашпартоў на новыя, што ўтрымліваюць індывідуальны падатковы нумар уладальніка. Многія праваслаўныя грамадзяне, упэўненыя ў тым, што гэтыя нумары ў пашпарце могуць мець лічбы, звязаныя з сатанізмам або падобнымі рэчамі, па пэўных звестках, адмаўляюцца падаваць заявы на атрыманне новых пашпартоў. У траўні мітрапаліт Філарэт, нягледзячы на зробленае раней тлумачэнне таго, што занясенне ў пашпарт індывідуальнага падатковага нумара не супярэчыць хрысціянскаму вучэнню, накіраваў у Савет Міністраў пасланне з просьбай стварыць альтэрнатыўную сістэму ўліку для тых, хто адмаўляецца атрымліваць новыя пашпарты. Па стане на 30 чэрвеня ўрад і БПЦ працягвалі сумесную работу па пошуку ўзаемапрымальнага вырашэння гэтага пытання.

Перад прыняццем закону аб рэлігіях прадстаўнікі многіх традыцыйных і нетрадыцыйных рэлігійных веравучэнняў заснавалі Грамадзянскую ініцыятыву за свабоду сумлення. Гэтая група актыўна выступала супраць закону аб рэлігіях і іншых дзяржаўных абмежаванняў у адносінах да рэлігійных груп. У студзені яна выдала другую частку «Белай кнігі» – зборніка дакументаў, якія падрабязна апісваюць шматлікія выпадкі парушэння ўрадам свабоды веравызнання. У ёй таксама прыводзіцца

інфармацыя аб заканадаўстве па пытаннях рэлігіі і размешчаны тэксты розных справаздач аб становішчы вакол рэлігійных свабод у краіне.

**Палітыка урада ЗША**

Урад ЗША абмяркоўвае пытанні свабоды веравызнання з урадам у межах сваёй агульнай палітыкі па абароне правоў чалавека. Супрацоўнікі амбасады падтрымлівалі рэгулярныя кантакты з прадстаўнікамі рэлігійных груп, Грамадзянскай ініцыятывай за свабоду сумлення і дзяржаўнымі службовымі асобамі, адказнымі за рэлігійныя пытанні. Праводзіліся таксама сустрэчы з грамадзянамі ЗША рознага веравызнання, якія пражываюць пэўны час у краіне або прыязджаюць у Беларусь, з мэтай абмеркавання пытанняў свабоды веравызнання у краіне. У сакавіку прадстаўнікі аб'яднанняў пратэстантаў, іудзеяў і крышнаітаў здзейснілі трохтыднёвую паездку ў ЗША ў рамках праграмы абменаў, якую праводзіць Дзяржддэпартамент. Удзельнікі праграмы праехалі па некалькіх амерыканскіх гарадах, сустракаючыся з дзяржаўнымі службовымі асобамі, прадстаўнікамі розных амерыканскіх рэлігійных кірункаў, НДА і іншых арганізацый.

Падчас сустрэч з рознымі дзяржаўнымі чыноўнікамі і прадстаўнікамі міністэрстваў і ведамстваў супрацоўнікі амбасады закраналі пытанні, звязаныя з новым законам аб рэлігіі, працягам продажу літаратуры, якая сее нецярпімасць, на мерапрыемствах і ў месцах, звязаных з БПЦ, працягам канфлікту вакол яўрэйскіх могілак у Гродна і закрыццём Еўрапейскага гуманітарнага універсітэта. Амбасада пільна сачыла за працягам продажу антысеміцкай і ксенафобскай літаратуры ў кіёсках і на мерапрыемствах, арганізаваных БПЦ, і праз дзяржаўную сетку распаўсюджвання. На працягу ўсяго справаздачнага перыяду супрацоўнікі амбасады таксама некалькі разоў ездзілі на месца яўрэйскіх могілак у Гродна і абмяркоўвалі сітуацыю з мясцовымі ўладамі і кіраўнікамі суполкі. Супрацоўнікі амбасады, а таксама сп. амбасадар, бралі ўдзел у шэрагу мерапрыемстваў, што праводзіліся рознымі рэлігійнымі групамі. Амбасада рэгулярна абмяркоўвала рэлігійныя пытанні з прадстаўнікамі замежных дыпламатычных місій, акрэдытаваных у краіне.

Амбасада працягвала сваю практыку правядзення круглых сталоў з удзелам рэлігійных лідэраў па абмеркаванні ключавых праблем, што датычацца свабоды веравызнання і праследавання вернікаў з боку дзяржавы. У лютым і сакавіку службовыя асобы Дзяржаўнага дэпартамента, уключна з намеснікам памочніка Сакратара па справах Еўропы і Азіі, што наведвалі Мінск, правялі сустрэчы з прадстаўнікамі некалькіх рэлігійных груп з мэтай ацэнкі сітуацыі вакол свабоды рэлігіі. Супрацоўнікі амбасады

рэгулярна сустракаліся з зацікаўленымі ў абмеркаваннні пытанняў свабоды веравызнання ў краіне грамадзянамі ЗША, што прыязджалі ў Беларусь.